# ИСТОРИЧЕСКИЕ СУДЬБЫ БЕЛОРУССКО-РОССИЙСКОГО ПРИГРАНИЧЬЯ

## КАШТОЎНАСНЫЯ АРЫЕНТАЦЫІ НАСЕЛЬНІЦТВА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ Ў ДЗЕЙНАСЦІ ПА АКАЗАННІ ДАПАМОГІ ПАЦЯРПЕЛЫМ АД ГОЛАДУ Ў ПАВОЛЖЫ (1921–1923 гг.)

*Г.Х. Базарэвіч*
*г. Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава, anna_bazarevich@mail.ru*

**Мэта артыкула** – аналіз каштоўнасных арыентацый насельніцтва савецкай Беларусі ў справе дапамогі галадаючым Паволжа.

**Ключавыя словы:** агітацыя, грамадская свядомасць, голад у Паволжы, гуманізм, каштоўнасныя арыентацыі.

Репозиторий ВГУ

У 1921 г. буйныя абшары Расіі моцна пацярпелі ад неўраджаю, пераважна, гэта былі тэрыторыі Паволжа, Урала, паўночнага Каўказа, Крыма і Украіны. Пра гэта бедства жыхары Беларускай ССР, Віцебскай і Гомельскай губерняў даведваліся праз паведамленні ў сваіх працоўных калектывах, прэсу, заўважным было і рэзкае павелічэнне колькасці бежанцаў у раёнах чыгуначных вузлоў. Ужо з ліпеня 1921 г. пра маштабы ахвяраў голаду пачалі сведчыць на масавых сходах, у грамадскіх месцах, на прадпрыемствах і ў навучальных установах, адным словам усюды, дзе быў магчымы кантакт з грамадствам.

Збор сродкаў пачаўся паралельна з агітацыйнай кампаніяй пасля арганізацыі камісій на месцах. Цэнтральная Камісія Памгол Беларусі прыступіла да працы 30 ліпеня 1921 г., арганізаваўшы свае аддзяленні ва щсих павятовых цэнтрах [1, арк. 111.]. Па пастанове прэзідыума выканаўчага камітэта Віцебскага губернскага Савета працоўных, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў 8 ліпеня 1921 г. была створана Віцебская губернская камісія па аказанні дапамогі галадаючым [2, арк. 37 зв.]. Пазней, на падставе пастановы УЦВК аб арганізацыі на месцах камісіі па арганізацыі працы дапамогі пацярпелым, пленум Гомельскага губвыканкама 26 ліпеня таксама стварыў губкампамгол [3, с. 55].

Галоўным чынам, шырокае інфармаванне было абумоўлена метадамі, якія ўрад планаваў выкарыстоўваць у ліквідацыі бедства ў Паволжы. У першую чаргу спадзяванні ўскладаліся на плённае супрацоўніцтва насельніцтва і дзяржавы, што ўвасобілася ў асноўным прынцыпе кампаніі: “Дзесяць сытых накормяць аднаго галоднага”. Улады разумелі, што поспех у ажыццяўленні пастаўленай мэты залежыў ад актыўнасці грамадства, у фарміраванні якой галоўную ролю мелі якасныя арыенціры, а таксама настроі ў грамадскай свядомасці.

Фарміраванне каштоўнасных арыенціраў насельніцтва ў поглядах на праблему голаду ў Паволжы залежала ад поглядаў і ідэй, якія панавалі ў палітычнай, прававой, эканамічнай, маральнай і рэлігійнай свядомасці. Таму невыпадкова дзейнасць дзяржаўных органаў па аказанні дапамогі галадаючаму насельніцтву Паволжа пачалася з шырокай агітацыйнай кампаніі. Каштоўнасныя сістэмы фарміруюцца і трансфармуюцца ў гістарычным развіцці грамадства і цесна звязаны са зменамі ў розных сферах чалавечага жыцця. Зразумела, што за кароткі перыяд сфарміраваць сістэму поглядаў на пытанне – задача досыць складаная, аднак, за два гады кампаніі

па аказанні дапамогі галадаючаму насельніцтву і ліквідацыі наступстваў бедства ў Паволжы, праца агітацыйных камісій не прыпынялася.

Задачай агітацыйных камісій з'яўлялася фарміраванне гатоўнасці да ахвяраванняў спрыяльных умоў у грамадстве для правядзення збораў на карысць галадаючых. Для складвання сістэмы каштоўнасцяў у гэтым напрамку патрабавалася наяўнасць пэўных арыенціраў па розным аспектам: усведамленне маштабаў голаду, дзяржаўны курс на ліквідацыю бедства і яго наступстваў, міжнародныя адносіны і дапамога, салідарнасць працоўных і сялян унутры і па-за межамі дзяржавы, унутрысацыяльныя адносіны, удзел рэлігійных арганізацый у дапамозе галадаючым, гістарычная памяць, усведамленне добрасуседскасці, а таксама маральны базіс насельніцтва. З улікам гэтых акалічнасцей і здзяйснялася выпрацоўка асноўных тэзісаў, часам не толькі стымулюючы актыўнасць насельніцтва, а і ў якасці "апраўдання" некаторых метадаў улады.

Для ўсведамлення маштабаў голаду і сітуацыі, якая складвалася ў Паволжы прыводзіліся лічбы ахвяраў бедства часта ў суправаджэнні падрабязнасцяў, апісанняў пакутаў, выпадкаў людаедства [4, арк. 31]. Такая інфармацыя з'яўлялася структурным элементам сістэмы каштоўнасных арыентацый прадстаўленых у ведах аб праблеме, фарміраванні эмацыйных адзнак і сістэмы пачуццяў. Усё гэта павінна было ўплываць і на сістэму паводзінаў у дачыненні да галадаючых у рэчышчы агульначалавечых каштоўнасцяў. Колькасць ахвяраў голаду расла з кожным днём. Для мэтавай дапамогі і прыёму бежанцаў за Беларускай ССР, Віцебскай і Гомельскай губернях замацоўвалася Саратаўская губерня з Аўтаномнай вобласцю немцаў Паволжа [5, с. 287]. Пацярпелыя страцілі свойскую жывёлу, насенне і каб аднавіць гаспадарку маглі разлічваць толькі на дапамогу суайчыннікаў і гуманітарных місій з замежжа. Для прысьпяшэння актыўнасці насельніцтва падкрэслівалася, што дапамога павінна быць своечасовай, лічылася, што "любое промедление смерти подобно" [6, арк. 31].

На погляды бяспекі і самазахавання павінен быў уплываць тэзіс аб вялікай колькасці бежанцаў, якія распаўсюджваюць эпідэміі не толькі ў сваіх колах, але і сярод мясцовага насельніцтва, пазбегнуць гэтага можна прытуліўшы і забяспечыўшы ім адпаведны нагляд. Такім чынам каштоўнасныя арыенціраў дабрачыннасці і міласэрнасці далучаюцца пачуццё самазахавання і інтэграцыі.

Адказнасць і грамадская актыўнасць становяцца новымі каштоўнаснымі арыенцірамі пасля рашэння ўрада замацаваць галадаючыя тэрыторыі за ўраджайнымі. Напрыклад, у Віцебскай губерні Аўтаномная вобласць немцаў Паволжа прасіла "…всего по 1/6 фунта хлеба в день на человека. Что составляет ежедневно по 2000 пудов" [6, арк. 31]. Важную ролю ў фарміраванні гатоўнасці выканаць грамадзянскі доўг мелі і фармулёўкі: "Кроме того нам прислано 3000 детей и прибыло громадное число беженцев. Которых мы должны накормить, приютить и обеспечить. Эту задачу мы должны выполнить во что бы то ни стало [6, арк. 31]. Такім чынам што стымуляванне ўсведамлення доўга да жытніцы, што забяспечвала ў свой час краіну, а зараз сама мае патрэбу ў дапамозе. Напрыклад, сяляне Лепельскага павета Віцебскай губерні памяталі пра выпадак, калі пры неўраджаі бульбы першымі адгукнуліся як раз павалжане [7, с. 1].

Умацаванне аўтарытэта ўлады таксама было задачай у фарміраванні сістэмы каштоўнасных арыентацый. Падкрэслівалася самаадданая праца савецкага ўрада, які рабіў усё магчымае для таго, каб уратаваць галодных, аднак, рэсурсаў дзяржавы хапала, каб накарміць толькі малую частку галадаючых. Выратаванне астатніх залежала ад усеагульных намаганняў насельніцтва, што патрабавала кансалідацыі ўсіх сілаў дзеля гуманнай і справядлівай працы.

У галоднай кампаніі былі выпрацаваныя тэзісы, якія павінны былі ўплываць на фарміраванне поглядаў на сусветную палітыку, а дакладней стварыць вобраз "сябра" і



Репозиторий ВГУ

“ворага” сярод капіталістычных дзяржаў. Даводзілася, што разлічваць на замежны капітал нельга, за выключэннем гуманітарных місій Ф.Нансэна, Амерыканскай адміністрацыі дапамогі, якія адгукнуліся на просьбы аб дапамозе. Такія тэзісы былі адлюстраваннем ідэалагічных установак маладой савецкай дзяржавы, а ў кантэксце галоднай кампаніі яны ўмацоўвалі веру ў салідарнасць міжнароднага пралетарыяту. Аднак сродкаў, якія паступалі з замежжа было недастаткова, так жа як і сродкаў з дзяржаўных крыніц і ўратаванне пацярпелых магчыма толькі пры актыўным удзеле насельніцтва ў аказанні дапамогі праз ахвяраванні.

Разлік рабіўся і на рэлігійныя каштоўнасныя арыентацыі. Рэзананснай была кампанія па канфіскацыі царкоўных каштоўнасцей, пастанова аб пачатку якой была прынятая ў лютым 1922 г. [8, с. 418]. Намеры ўлады тлумачыліся неабходнасцю знайсці сродкі для закупкі харчавання за мяжой. Першапачатковая ініцыятыва надавалася вернікам, якія прапанавалі рэалізоўваць золата, каштоўныя рэчы з храмаў. Гэта неабходнасць лягла ў аснову дэкрэта аб канфіскацыі царкоўных каштоўнасцей.

З аднаго боку хрысціянскія ідэалы і маральныя ўстаноўкі міласэрнасці, любові да бліжняга, спачуванне маглі быць асноўнымі матывацыяй падчас гэтай кампаніі. З другога боку хрысціянскія каноны парушаліся: канфіскаваліся прадметы культу без якіх адпраўленне службы было немагчымым, хоць паводле дэкрэту канфіскацыя такіх не прадугледжвалася. Таму супраціўленне з боку святароў і вернікаў было выклікана парушэннем гэтых канонаў [8, арк. 5]. Падчас правядзення гэтай кампаніі падкрэслівалася таксама і арыентацыя на права ўласнасці народа, які ў свой час набыў гэтыя каштоўнасці, а зараз мусіць выкарыстаць іх дзеля свайго выратавання.

Такім чынам, выпрацоўка тэзісаў, якія мусілі ўплываць на фарміраванне каштоўнасных арыентацый насельніцтва савецкай Беларусі ажыццяўляліся ў адпаведнасці з агітацыйнай кампаніяй, якая праводзілася ў РСФСР. Абумоўлены абставінамі, гэты працэс быў штучна паскораны. Сістэма каштоўнасных арыентацый нават у рэчышчы адной праблемы складваецца і трансфармуецца падчас гістарычнага развіцця, што і тлумачылася інтэнсіўным разгортваннем агітацыі і прапаганды. Верагодна, паспяховае засваенне прынцыпаў было магчыма ва ўмовах эканамічнай, палітычнай і сацыяльнай стабільнасці. Але пачатак 1920-х гг. для маладой савецкай дзяржавы быў часам станаўлення ўлады, складвання эканамічнай палітыкі, будаўніцтва грамадства новага тыпу. Гэтыя фактары ўплывалі на актыўнасць насельніцтва ў дзейнасці па аказанні дапамогі галадаючаму насельніцтву Паволжа. Выкананне галоўнай задачы – фарміраванне добраахвотнага жадання ахвяраваць – было недапушчальна запаволеным. Гэта прывяло да змянення падыходаў у курсе па ліквідацыі наступстваў бедства і ўвядзенні абавязковых падаткаў і адлічэнняў, што было характэрным для камандна-адміністрацыйных метадаў кіравання.

Спіс выкарыстанай літаратуры


1. Отчет о работе ЦК Помгол Беларуси // НАРБ. Ф.6. Воп.1. Спр.97.
2. Протокол заседания Витебскго губисполкома 1921 г. // ДАВВ. Ф. 570. Воп.1. Спр. 36.
3. Отчёт Гомельского губернского исполнительного комитета, декабрь 1921 г. – ноябрь 1922 г. – Гомель, 1922. 417 с.
4. Тезисы к кампании по изъятию церковных ценностей // ДАВВ. Ф. 123. Воп. 1. Спр. 771.
5. Итоги борьбы с голодом 1921 – 1922 гг.: сборник статей и отчетов. М., 1922. 499 с.
6. Тезис 4 // ДАВВ. Ф. 123. Воп. 1. Спр. 771.
7. 2-я Лепельская уездная конференция крестьян // Известия Витебского губисполкома и Губкома Р.К.П. (б). 1922. 29 сак.
8. Декреты и распоряжения / Итоги борьбы с голодом 1921 – 1922 гг.: сборник статей и отчетов. М., 1922. 499 с.
9. Письмо Витебского викария // ДАВВ. Ф. 123. Воп. 1. Спр. 754.


Рэпазіторый ВДУ